ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 13 (1239) ● 12 красавіка 1979 г. Цана 2 кап.



У той красавіцкі дзень

Я добра памятаю той сонечны красавіцкі дзень.

...Хочацца сабрацца з думкамі, зразумець, адчуць наступаючае здзяйсненне, але нешта ўпарта перашкаджае засяродзіцца. Што гэта? А, гэта конік...

Я гляджу ўдалечыню, туды, дзе ўзвышаецца гіганцкае цела ракеты. Серабрыстая, вялізная, без падтрымліваючых мантажных ферм, яна так проста ўпісваецца ў панараму стэпу.

А там, на вяршыні фантастычнай цыгары, за халоднымі лістамі металу, за моцнай тканінай скафандра — чалавек.

Там — Юрый...

— Пад'ём!

— Паехалі! — чуем мы крыху скажоны радыёпрыёмнікам голас нашага сябра і, здаецца, вастрэй, чым ён, адчуваем, як напружыліся мільёны конскіх сіл рухавікоў ракеты, каб разарваць ланцугі зямнога палону.

Жудасны грукат, агонь, дым, і зноў агонь пракаціліся па стэпу. Серабрыстая цыгара павольна адарвалася ад стартавай пліты і, як бы не хочучы, пайшла ў неба.

Пасля таго, як сціх гул рухавікоў, я зноў пачуў усё тое жраўнадушнае стракатанне коніка.

...Калі мы, апранутыя ў скафандры, ехалі на касмадром, адзін з вучоных нагнуўся да Гагарына, абняў яго і... заплакаў.

Юрый паціснуў яму руку і сказаў, як дзіцяці:

— Ну, ну, нельга...

А праз 108 мінут вучоны зноў абняў Юрыя. Юрый быў такі ж зямны, як і перад стартам, і не зусім такі. Ён толькі што вярнуўся з космасу. І цяпер многія, хто сустракаў яго на саратаўскай зямлі, не маглі стрымаць слёз, слёз радасці за вялікую перамогу Чалавека...

Герман ЦІТОЎ,
Герой Савецкага Саюза, лётчык-касманаўт СССР.

ПА БДУ — ФАРМАЛЬНА

На сходзе студэнтаў механіка-матэматычнага факультэта, якія жывуць у інтэрнаце № 7, была заслухана справаздача аб рабоце студсавета мехмата і выбран новы састаў студсавета. На сходзе прысутнічаў намеснік дэкана факультэта А. А. Бурдун.

У справаздачы давалася ацэнка работы студсавета, гаварылася аб тых праблемах, якія стаялі і стаяць перад студсаветам факультэта. Былі названы недахопы ў палітыка-выхаваўчай рабоце ў інтэрнаце.

Удзельнікі сходу прааналізавалі прычыны парушэнняў парадку, разгледзелі метады іх ліквідавання. Узнімалася пытанне аб санітарным стане пакояў, іх эстэтычным афармленні.

У сваім выступленні намеснік старшыні прафкома БДУ В. Бяляеў адзначыў, што патрэбна шырэй разгортваць сацыялістычнае спаборніцтва, па-сапраўднаму наладзіць яго паміж пакоямі і суседнімі інтэрнатамі.

Гаварылі і аб тым, што інтэрнаты № 2, № 6 і № 7 будуць удзельнічаць у Алімпіядзе-80. Патрэбна яшчэ больш увагі ўдзяліць афармленню гэтых інтэрнатаў, шырэй і цікавей расказваць аб жыцці студэнтаў.

М. ЛАХВІЧ.
(Прэс-цэнтр прафкома).

***

Нядаўна на II курсе гістарычнага факультэта адбылася сустрэча з сябрамі з Грэцыі— камуністамі гэтай краіны Сарадзіс Янесам, Фаціпос Дзімітрасам і Падардтзіс Ніколасам, якая была арганізавана камсамольскім бюро курса.

Сустрэча была прысвечана II з'езду Камуністычнай партыі Грэцыі, дэлегатам якога, у прыватнасці, будзе наш сябар Сарадыс Янес. Ён выступіў на сустрэчы, расказаў аб гісторыі барацьбы камуністаў Грэцыі за свае правы, а таксама адказаў на шматлікія пытанні.

Фаціпос Дзімітрыс у сваім выступленні расказаў аб становішчы рабочага класа Грэцыі, яго барацьбе за паляпшэнне свайго становішча. Разам з тым ён звярнуў увагу і на маладзёжны і студэнцкі рух у Грэцыі.

Грэчаскія камуністы выразілі сваю гатоўнасць працягваць барацьбу супраць бяспраўнага становішча рабочага класа і беспрацоўя. У іх выступленнях прагучалі словы ўдзячнасці ў адрас нашай партыі, якая заўсёды з'яўлялася і з'яўляецца сапраўдным сябрам усіх прагрэсіўных сіл свету.

Сустрэча выклікала вялікую цікавасць і ўвагу студэнтаў курса.

М. РУСАКОВІЧ.

***

5 красавіка гасцямі флагмана беларускай навукі былі вучні выпускных класаў школ Кастручніцкага і Першамайскага раёнаў сталіцы.

Ад імя рэктарата і грамадскіх арганізацый БДУ юнакоў і дзяўчат шчыра вітаў прарэктар па вучэбнай рабоце Уладзімір Рыгоравіч Івашын.

У сваім выступленні ён пазнаёміў будучых абітурыентаў з гісторыяй Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, з яго сённяшнім днём.

Прадстаўнікі факультэтаў расказалі прысутным аб гісторыі ўзнікнення сваіх факультэтаў, аб іх структуры.

У канцы гутаркі адказны сакратар прыёмнай камісіі паведаміў будучым студэнтам правілы прыёму ва універсітэт, пазнаёміў з парадкам прыёму дакументаў і здачы ўступных экзаменаў.

Пасля гутаркі будучыя абітурыенты наведалі факультэцкія лабараторыі, пазнаёміліся са студэнтамі універсітэта.

С. СІНІЛАЎ.

***

На базе Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна адбыўся абласны семінар кіраўнікоў лектарскіх груп студэнцкіх будаўнічых атрадаў ВНУ і тэхнікумаў.

Семінар правялі абласны камітэт ЛКСМБ разам з камітэтам камсамола і арганізацыяй таварыства «Веды» універсітэта.

350 маладых лектараў праслухалі лекцыі аб знешняй палітыцы КПСС, ленінскіх прынцыпах камуністычнай прапаганды, структуры лекцый, этыцы чалавечых зносін, археалагічных помніках Беларусі. Лекцыі чыталі доктар юрыдычных навук, прафесар М. І. Прарубаў; доктар біялагічных навук, прафесар А. А. Логінаў; кандыдат філасофскіх навук, дацэнт В. А. Аляшкевіч; выкладчык К. П. Кажэўнікаў і іншыя.

Атрыманыя веды студэнты будуць прымяняць у час працоўнага семестра, чытаючы лекцыі на будоўлях, у школах, калгасах, саўгасах нашай рэспублікі і за яе межамі.

Л. КЛЯУС,
адказны сакратар універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды».

ПАРТЫЙНАЯ ХРОНІКА

У партыйных арганізацыях БДУ прайшлі партыйныя сходы, на якіх камуністы абмеркавалі важныя, надзённыя пытанні. Камуністы журфака, юрфака і факультэта радыёфізікі і электронікі на сваіх сходах вялі гаворку аб выніках грамадска-палітычнай атэстацыі. На журфаку з дакладам выступіў кандыдат гістарычных навук, дацэнт П. І. Бондар. Ён адзначыў, што грамадска-палітычная атэстацыя прайшла арганізавана, на належным узроўні, але ў ходзе яе выявіліся і недахопы. Камуністам неабходна шмат папрацаваць над тым, каб у наступным годзе грамадска-палітычная атэстацыя прайшла яшчэ больш паспяхова.

✦

На юрыдычным факультэце перад камуністамі з дакладам аб выніках грамадска-палітычнай атэстацыі выступіла дацэнт К. А. Барзова. У ходзе абмеркавання дакладa камуністы ўнеслі шэраг прапаноў: канкрэтызаваць індывідуальныя планы студэнтаў, выпрацаваць больш канкрэтныя крытэрыі атэстацыі, адмовіцца ад дыферэнцыраваных адзнак пры атэстацыі, адзнакі па грамадска-палітычнай атэстацыі аператыўна змяшчаць на экране.

Э. КАЛІНІНА,
дацэнт, член партбюро юрфака.

✦

У партыйнай арганізацыі спецыяльнага канструктарска-тэхналагічнага бюро з вопытнай вытворчасцю прайшоў партыйны сход, на якім былі абмеркаваны задачы калектыву па падрыхтоўцы і правядзенню ленінскага суботніка.

✦

У партыйнай арганізацыі філалагічнага факультэта прайшоў сход, на якім з дакладам «Аб стане і мерах па паляпшэнню работы куратараў акадэмічных груп» выступіла дацэнт В. А. Захарава.

✦

Камуністы выдавецтва і друкарні БДУ абмеркавалі на партыйным сходзе выкананне плана I квартала бягучага года, намецілі меры па паспяховаму выкананню плана II квартала.

З дакладам па гэтаму пытанню выступіў дырэктар выдавецтва В. С. Грыгор'еў.

На партыйным сходзе было таксама разгледжана пытанне аб вытворчым навучанні ў выдавецтве і друкарні. Па гэтаму пытанню выступілі галоўны рэдактар выдавецтва Н. Ф. Бязрукава і дырэктар друкарні М. М. Шкурдзюк.

У залікоўцы сабрана салідная «калекцыя» прафесарскіх аўтографаў. Колькі хваляванняў прыйшлося перажыць перад кожным экзаменам і залікам! Але цяпер усё засталося ззаду. І хвалюе ўжо іншае: куды паеду я праз некалькі месяцаў са сваім новенькім дыпломам! Што чакае мяне наперадзе, у які калектыў я патраплю!

Размеркаванне... Момант гэты заўсёды хвалюе, абяцае вялікія змены ў жыцці. Пяцікурснікі ўсіх факультэтаў у гэтыя красавіцкія дні дружным натоўпам стаяць ля аўдыторый з кароткім надпісам «Размеркаванне». Яшчэ некалькі хвілін— і дылема вырашыцца.

Хочацца верыць, што ўсім ім пашанцуе, кожны атрымае цікавую работу, аб якой марыў усе студэнцкія гады, да якой упарта ішоў нялёгкім студэнцкім шляхам.

Поспехаў вам, пяцікурснікі!

НА ЗДЫМКУ: размеркаванне на механіка-матэматычным факультэце.

Фота **М Дубовіка.**

Суботнік салідарнасці

Нядаўна савет дружбы БДУ прыняў рашэнне правесці суботнік салідарнасці і ўсе заробленыя грошы пералічыць у фонд дапамогі В'етнаму.

У суботніку прымалі ўдзел студэнты з В'етнама, Лаоса, ГДР, ЧССР, Польшчы, Гвінеі, Кубы, Грэцыі, усяго — 115 чалавек.

На суботніку студэнты добра папрацавалі. Напрыклад, у радыёгазеце на прадпрыемстве «Прамень» сярод лепшых працаўнікоў суботніка прагучалі і прозвішчы нашых студэнтаў Моніки Жрайнер, Монікі Цын, Сільвіі Кестнер, Брыгіты Шлегель, Лубаміра Сташ, Чэстміра Градзечнага і іншых.

Вельмі добра студэнты працавалі і на будаўніцтве алімпійскіх аб'ектаў.

Савет дружбы дзякуе ўсім удзельнікам суботніка за іх удзел у ім і за добрыя адносіны да працы.

Іржына СМУЖОВА,
старшыня савета дружбы БДУ.

ЗАПРАШАЕ «ПАЛІТЫКАС»

30 сакавіка 1979 года споўнілася першая гадавіна з дня заснавання дыскусійна-палітычнага клуба «Палітыкас», створанага па ініцыятыве студэнтаў-фізікаў і групы замежных студэнтаў. У сучасны момант у СССР існуюць толькі 2 падобныя клубы: адзін ва універсітэце дружбы народаў імя Патрыса Лумумбы, другі — у нас.

Дык што ж такое «Палітыкас»? Гэта клуб, на чале якога стаяць два прэзідэнты: ад замежных студэнтаў і ад савецкіх. Існуе арганізацыйнае бюро з 7 чалавек — прадстаўнікоў зямляцтваў, якое плануе кожнае чарговае пасяджэнне, рыхтуе яго, запрашае цікавых людзей, апавяшчае аб чарговым пасяджэнні. Ядро клуба — 10—12 пастаянных членаў, якія актыўна прымаюць удзел ва ўсіх пасяджэннях. Састаў клуба не з'яўляецца строга абмежаваным і пастаянным, таму што ў нас дзейнічае прынцып зацікаўленасці: калі табе цікава — прыходзь, не пашкадуеш... І не шкадуюць!

Мы пачалі з 10 энтузіястаў, а зараз на нашых пасяджэннях прысутнічаюць ад 20 да 30 чалавек. Невялікі, але поспех!

Спецыфіка клуба заключаецца і ў тым, што тут можна атрымаць інфармацыю з першых рук, часам ад сведкаў тых або іншых падзей, задаць любое пытанне, адстойваць сваё меркаванне, даведацца і адчуць, што быць па-за палемікай, па-за барацьбой двух светаў на нашай планеце — немагчыма.

Мэта клуба: прыцягнуць як мага больш замежных студэнтаў да свабоднага абмену меркаваннямі па актуальных міжнародных праблемах, даць іх асвятленне з класавых, марксісцка-ленінскіх пазіцый.

Чакаем вас на нашых пасяджэннях!

І. ВЕЛІЧАНСКІ,
студэнт гістфака.

Карыснае параўнанне

Вучэбна-вытворчая камісія прафкома праверыла стан навукова-даследчай работы на хімічным і біялагічным факультэтах. Па выніках лютаўскай праверкі вучэбна-вытворчая камісія прафбюро біяфака заняла трэцяе месца, але вынікі сакавіцкай праверкі паказалі, што зараз яна працуе не на патрэбным узроўні.

Лічыцца, што студэнцкай навуковай работай на біялагічным факультэце ахоплена 74 працэнты студэнтаў. Але калі члены камісіі прафкома універсітэта пацікавіліся планамі работы студэнцкага навуковага таварыства і вучэбна-вытворчай камісіі прафбюро біяфака, іх, як і пратаколаў пасяджэнняў СНТ, зусім не аказалася.

Дык аб якой рабоце можа ісці гаворка? Чым жа займаецца гэта камісія? Адказ быў такі:

— У гэтым месяцы мы дапамагаем у арганізацыі навуковай алімпіяды.

Гэтым і абмежавалася навуковая работа на біяфаку ў сакавіку.

Зусім іншая карціна на хімічным факультэце. Тут 56 працэнтаў студэнтаў займаецца навуковай работай. Кожны з іх атрымлівае асабістае заданне, тэму. Спачатку прыходзіцца папрацаваць у чытальнай зале, падабраць неабходную літаратуру, зрабіць тэарэтычныя распрацоўкі і толькі тады прыступіць да лабараторных работ.

Старшыня вучэбна-вытворчай камісіі хімфака Люда Віткевіч падрабязна расказала аб сваёй рабоце. На факультэце аформлен стэнд «Студэнт і навука», дзе расказваецца аб навуковых даследаваннях кожнай кафедры, змешчаны фатаграфіі лепшых членаў СНТ. Каля бюлетэня заўсёды шумна. Ён выпускаецца два разы ў месяц, і студэнты з цікавасцю чакаюць новых нумароў, горача іх абмяркоўваюць.

Многа расказала Люда Віткевіч аб конкурсе на лепшую эмблему навуковага таварыства, які правёў навуковы студэнцкі савет. Акрамя таго, НСС вядзе перапіску з іншымі універсітэтамі краіны, прапагандуе навуковую работу, імкнецца ахапіць ёю найбольшую колькасць студэнтаў.

А. АЎРУСЕВІЧ,
(Прэс-цэнтр прафкома).

Сустрэчы з мужнасцю

НА ПАДРЫХТОЎЧЫМ аддзяленні БДУ імя У. І. Леніна ў групе беларускіх філолагаў і журналістаў добра наладжаны вучэбны працэс і культурна-масавая работа. Наведванне тэатраў, правядзенне дыспутаў сталі звычайнай справай у групе.

Акрамя таго, актывам групы нядрэнна вядзецца работа па патрыятычнаму выхаванню. Аб подзвігу нашых бацькоў і старэйшых таварышаў у Вялікай Айчыннай вайне мы, маладое пакаленне, ведаем толькі з гісторыі, па мастацкіх творах і фільмах, таму з цікавасцю сустракаемся з удзельнікамі гераічных бітваў супраць ворагаў Радзімы.

У першым семестры мы правялі сустрэчу з выхаванцам камуны імя Макаранкі, удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны І. А. Багданавым. Камуніст расказаў нам аб сваім цяжкім выпрабаваннем стойкасці і мужнасці і для маладога хлопца.

Цяпер І. А. Багданаў працуе ў таварыстве «Веды» міжнародным аглядальнікам. І заўсёды ён — жаданы госць моладзі.

А нядаўна мы сустрэліся з выкладчыкам факультэта журналістыкі нашага універсітэта Г. З. Бегуном. Знаёмства з ветэранам вайны, разведчыкам асобай групы партызанскага атрада вельмі ўразіла нас. Яшчэ юнаком Георгій Захаравіч папаў у партызанскі атрад. За жывы характар, кемлівасць яго залічылі ў асобую групу разведвальнага атрада. Адно з заданняў было асабліва цяжкім і складаным. Патрэбна было даведацца аб прычыне, па якой загінулі звязныя, праверыць яўкі, наладзіць сувязь і вывезці з горада сям'ю военачальніка.

...І вось разведчык у акупіраваным Мінску. Некалькі явак былі правалены. Сувязь перарвалася, малады хлопец на заключным этапе задання быў схоплен гітлераўцамі. Дні і ночы катаванняў не маглі вырваць прызнання ў савецкага разведчыка. А пасля ўсіх жахаў — уцёк, і нарэшце — у сваіх.

Пасля вайны бясстрашны разведчык паступае на факультэт журналістыкі БДУ, а пасля заканчэння застаецца там жа выкладчыкам.

На вялікіх подзвігах простых савецкіх людзей мы вучымся таму, як трэба жыць, працаваць, любіць сваю Радзіму.

В. ЛОМШЫК,
слухач ПА.

П А Л А Ж Э Н Н Е

АБ ПРАВЯДЗЕННІ АГЛЯДУ АГІТАЦЫЙНА-МАСТАЦКІХ БРЫГАД СБА БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА, ПРЫСВЕЧАНАГА 25-ГОДДЗЮ АСВАЕННЯ ЦАЛІНЫ

Мэта агляду — прапаганда сродкамі мастацтва сусветна-гістарычнага значэння Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, подзвігу савецкага народа у Вялікай Айчыннай вайне, гераічнай гісторыі Камуністычнай партыі, Савецкай дзяржавы і Ленінскага камсамола, рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцый савецкага народа, самаадданай працы рабочага класа, калгаснага сялянства і народнай інтэлігенцыі— будаўнікоў камуністычнага грамадства, а таксама павышэнне ідэйна-мастацкага ўзроўню рэпертуару і выканаўчага майстэрства агітбрыгад, умацаванне іх сувязі з жыццём, узмацненне ролі агітбрыгад у камуністычным выхаванні працоўных.

Агляд-конкурс агітбрыгад СБА Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна будзе праводзіцца ў два туры. Першы тур агляду павінен быць праведзен на факультэтах да 17 красавіка. У састаў журы факультэта ўваходзяць члены камітэта камсамола БДУ, члены штаба працоўных спраў факультэта. Агітбрыгадзе, заняўшай першае месца на факультэцкім аглядзе-конкурсе, прадастаўляецца права ўдзелу ў конкурсе другога тура агульнауніверсітэцкага агляду агітбрыгад СБА, які адбудзецца 23—25 красавіка.

Колькасць удзельнікаў агітбрыгады—не менш 10 чалавек. Працягласць выступлення — 30 мінут.

Для больш паспяховага выступлення ў аглядзе-конкурсе кожнай агітбрыгадзе неабходна выкарыстаць вакальны, музычны, харэаграфічны жанры, мастацкае слова, а таксама рэкамендуецца прымяніць усе даступныя тэхнічныя сродкі: кіна- і дыяпраектары, фільмаскопы, магнітафоны і г. д.

Кіраўнікі агітбрыгад прадстаўляюць у камітэт камсамола універсітэта не пазней 10 красавіка г. г. сцэнарый выступлення агітбрыгады.

Ацэнка выступлення будзе праводзіцца па 10-бальнай сістэме і па наступных паказчыках:

— актуальнасць і грамадская значнасць рэпертуару;

— выкананне палажэння аглядуконкурсу:

— выканаўчае майстэрства ўсяго саставу;

— музычнае афармленне і суправаджэнне выступлення;

— сцэнічная культура;

— сцэнарый выступлення, кампазіцыйнае рашэнне праграм.

Пераможцы вызначаюцца па найбольшай суме набраных балаў. Журы мае права заахвочваць агітбрыгады ад 5 да 10 балаў за добрае сцэнічнае рашэнне праграмы.

Агітбрыгады, заняўшыя прызавыя месцы у аглядзе-конкурсе II тура, узнагароджваюцца граматамі камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна.

Пераможцы агляду-конкурсу прымуць удзел у абласным аглядзе агітбрыгад студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

ДРУЖБЕ МАЦНЕЦЬ

У канцы сакавіка паміж камсамольскай арганізацыяй БДУ імя У. І. Леніна і арганізацыяй Дзімітраўскага Камуністычнага Саюза Моладзі балгарскіх студэнтаў, якія займаюцца ў Мінску, было падпісана пагадненне аб дружбе і супрацоўніцтве. Канкрэтную дапамогу з боку універсітэта ў арганізацыі сумесных мерапрыемстваў аказвае факультэт прыкладной матэматыкі. Асноўнымі напрамкамі з'яўляюцца: знаёмства балгарскіх сяброў з савецкай сучаснасцю; арганізацыя культурна-масавых мерапрыемстваў, якія ўключаюць правядзенне дыскатэк, наведванне музеяў, тэатраў і выставак, падрыхтоўку і святкаванне нацыянальных свят абедзвюх краін; правядзенне спартыўных спаборніцтваў паміж членамі балгарскага зямляцтва і студэнтамі ФПМ, удзел у турысцкіх злётах і паходах.

З 23 па 29 красавіка на факультэце будзе праходзіць Тыдзень савецка-балгарскай дружбы. Плануецца арганізаваць сустрэчы балгарскіх студэнтаў са студэнтамі ФПМ, аформіць стэнды аб НРБ і БССР, правесці факультэцкую віктарыну «Ці ведаеш ты Балгарыю?», падрыхтаваць вечар савецка-балгарскай дружбы. На працягу гэтага Тыдня савецкія і балгарскія студэнты сустрэнуцца на спартыўных пляцоўках — будуць праведзены матчы па баскетболу і міні-футболу.

І. КАЛЯГІНА,
намеснік сакратара камітэта камсамола ФПМ па інтэрработе.

На здымку: сакратар ДКСМ Пётр Марыкаў і А. Гаралёва.

ПЛЁН ПРАЦЫ СУМЕСНАЙ

З МІХАІЛАМ Міхайлавічам Кавалёвым, кандыдатам фізіка-матэматычных навук, дацэнтам кафедры матэматычнага забеспячэння АСК факультэта прыкладной матэматыкі мяне пазнаёміў начальнік аддзела замежных сувязей універсітэта А. А. Амялькоў. Ад яго я і даведаўся, што М. Кавалёў вось ужо дзевяць год разам з выкладчыкам Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера Эберхардам Гірліхам вядзе даследаванні ў галіне распрацоўкі і прымянення матэматычных метадаў рашэння задач аптымальнага планавання. Па гэтай тэме яны апублікавалі сумесна больш за 20 прац, неаднаразова выступалі з дакладамі на міжнародных канферэнцыях.

— Цікава тое, — адзначыў Анатолій Аляксандравіч,—што Міхаіл і Эберхард разам займаліся ў аспірантуры ў нас, ва універсітэце, прычым выдатна займаліся, і цяпер сумесна працуюць над адной тэмай. К гэтаму можна толькі дабавіць, што яны добрыя сябры.

І вось цяпер, калі Э. Гірліх знаходзіцца ў нашым універсітэце (яны з М. Кавалёвым заўсёды сустракаюцца раз у год для абмеркавання даследаванняў), я атрымаў магчымасць сустрэцца з сябрамі-калегамі.

— Эберхард, вам, як госцю, першае пытанне. Раскажыце, калі ласка, крыху пра сябе і аб тым, з чаго пачыналася ваша супрацоўніцтва з М. Кавалёвым?

— Упершыню з Міхаілам я пазнаёміўся ў 1971 годзе, калі знаходзіўся ў Мінску ў якасці кіраўніка групы нямецкіх студэнтаў-матэматыкаў, якія праходзілі ва універсітэце азнаямленча-вытворчую практыку. Гэта было ў маі месяцы, а з верасня гэтага ж года мы з ім разам ужо займаліся ў аспірантуры і пачалі разам працаваць. Гэтаму папярэднічаў і такі факт: з'яўляючыся супрацоўнікам кафедры «Вылічальная матэматыка і аптымізацыя» Іенскага універсітэта, я сустрэўся з кіраўніком групы беларускіх студэнтаў-практыкантаў прафесарам І. А. Ямелічавым, які запрасіў мяне для сумеснай працы ў Беларускі універсітэт.

Успамінамі аб вучобе ў аспірантуры і першых кроках у даследчай працы дзеліцца Міхаіл Міхайлавіч:

— Час вучобы ў аспірантуры быў самы цікавы і, напэўна, самы бесклапотны ў нашым жыцці. Акрамя працы над дысертацыяй, мы не мелі ніякіх іншых клопатаў. Галоўны наш дэвіз быў: працаваць не менш 10 гадзін у суткі, выключэнняў амаль не было нават у выхадныя дні.

Цяжкасці, вядома, былі, і галоўная — недастатковае веданне замежных моў. Мы размаўлялі на «нямецка-рускай» мове, а літаратуру даводзілася чытаць у асноўным на англійскай. Кожны разумеў яе па-свойму. Але што датычыць навуковай працы — усё атрымлівалася! Праз два гады нашай сумеснай дзейнасці я абараніў дысертацыю, яшчэ праз год абараніўся і Эберхард.

— Вы разам, відавочна, не аднойчы выступалі на навуковых канферэнцыях. Якая з іх вам найбольш запомнілася?

Э. Гірліх:

— Напэўна, адна з першых, у якой мы прымалі ўдзел, — IV Міжнародная канферэнцыя па эканамічнай кібернетыцы ў Дрэздэне. У сумесным дакладзе мы расказалі аб выніках сваіх даследаванняў у галіне аўтаматызацыі праектавання стандартаў і падзяліліся вопытам выкарыстоўвання нашых распрацовак у народнай гаспадарцы. Даклад выклікаў цікавасць спецыялістаў, нам быў заказан артыкул для міжнароднага часопіса. Мы з Міхаілам атрымалі запрашэнне выступіць на навуковых семінарах матэматыкаў у вышэйшых навуковых установах Берліна, Веймара, Карл-Маркс-Штата, Мерзебурга. Асабліва важным з'явілася наведванне Горнай Акадэміі ў Фрайберзе, старэйшай навуковай установы, дзе ў свой час праходзіў стажыроўку М. В. Ламаносаў.

— Трэба адзначыць яшчэ,— дадае М. М. Кавалёў, — што супрацоўніцтва з Горнай Акадэміяй прыносіць немалую карысць. Прафесарам М. Шохам, з якім у нас існуе цесная сувязь, распрацаваны цікавыя метады рашэння задач аператыўнага ўпраўлення на горных рудніках. Гэтыя метады намі выкарыстоўваюцца пры стварэнні аўтаматызаванай сістэмы кіравання на салігорскіх калійных рудніках. Сумесна з М. Шохам і В. Рунге знойдзена некалькі новых мадэлей аптымізацыі работы канвеернага транспарту ў шахтах.

— Як мне вядома, вы штогод сумесна падводзіце вынікі даследаванняў. Чаму была прысвечана ваша цяперашняя сустрэча?

Э. Гірліх:

— Для юбілейнага зборніка, прысвечанага 30-годдзю ўтварэння ГДР, мы закончылі артыкул, у якім дадзены агляд нашых сумесных распрацовак.

— Вашы бліжэйшыя планы?

М. М. Кавалёў:

— Закончыць манаграфію «Нелінейная дыскрэтная аптымізацыя», над якой разам працуем. Выданне кнігі запланавана адначасова ў ГДР і СССР.

— А больш далёкія перспектывы супрацоўніцтва?

— Мы зацікаўлены ў найбольш шырокім укараненні распрацаваных метадаў дыскрэтнай аптымізацыі ў народную гаспадарку. Да гэтага часу нашы метады ў асноўным прымяняліся на горных прадпрыемствах і пры аўтаматызацыі праектавання аптычных прыбораў на заводзе «Цэйс-Іена». Аднак метады могуць выкарыстоўвацца і ў іншых галінах, усюды, дзе патрэбна аптымальная структура дыскрэтнай сістэмы.

— І апошняе пытанне, Міхаіл Міхайлавіч: у чым вы бачыце важнасць навуковага супрацоўніцтва вучоных розных краін?

— Міжнароднае навуковае супрацоўніцтва мае, на мой погляд, тры аспекты. Па-першае, у кожнай краіне традыцыйна існуюць моцныя і слабейшыя навуковыя напрамкі. Таму сувязь вучоных розных краін, а такім чынам і розных школ — узаемавыгадная. Па-другое, міжнародная ўзаемадзейнасць вучоных з'яўляецца найбольш эфектыўнай сістэмай правільнай ацэнкі напрамку і паспяховасці яго развіцця. Яна забяспечвае сусветны ўзровень навуковых даследаванняў і гарантуе пазбаўленне ад дробязных, неперспектыўных. І нарэшце, узаемаадносіны паміж вучонымі розных краін садзейнічаюць умацаванню дружбы і міру на ўсёй планеце.

Гутарку вёў
В. ТАБУЛІН.

НАРОДНЫ КАНТРОЛЬ У ДЗЕЯННІ

Паляпшаць грамадскае харчаванне

Народны кантроль універсітэта, прафком пастаянна трымаюць у полі зроку работу грамадскага харчавання БДУ.

Як абстаяць зараз справы ў сталовых і буфетах?

Звернемся, напрыклад, да работы сталовай галоўнага корпуса. Наведвальнікі яе выказваюць пажаданні наконт паляпшэння смакавых якасцей падрыхтаванай ежы. Парушаецца тут і тэхналогія мыцця посуду.

Як выявілася ў час гутаркі з загадчыцай сталовай Т. І. Богуш, тут часта псуецца каналізацыя, не бывае цёплай вады. Пры складанні акта камісія ўлічыла заўвагі і прапановы загадчыцы і рабочых сталовай.

У снежні мінулага года рэйдавая камісія праверыла работу сталовых НДІ ПФП і СКТБ. У сталовай НДІ ПФП у пасудамыйцы не працавала мыечная машына, адсутнічала сушыльная шафа. Як вынік — лыжкі і відэльцы з тлушчам падаюцца на стол наведвальнікаў. Парушаюцца правілы захоўвання прадуктаў, лепшым жадае быць і санітарны стан у гарачым цэху. Рэдкасцю з'яўляюцца папяровыя сурвэткі на сталах. Дарэчы, гэта датычыцца амаль усіх сталовых.

Нявырашаным застаецца ўсюды пытанне аб скарачэнні часу, за які адпускаюць ежу. Якасць страў, па водгуках наведвальнікаў, не заўсёды на належным узроўні.

Не лепшае становішча і ў сталовай СКТБ. Дарэчы, хлеб тут вырашылі захоўваць разам з кансервамі і іншымі «несумяшчальнымі» прадуктамі.

Асобна хочацца сказаць наконт сталовай № 33 (інтэрнат № 5). Не вельмі даўно ў газеце быў змешчан крытычны матэрыял аб рабоце гэтага пункта харчавання. Не варта зноў гаварыць аб недахопах, якія ўказваліся раней. Тут іх будзе яшчэ больш. Цікава, як ставяцца да шматлікіх крытычных заўваг загадчыца сталовай Кулікова і адміністрацыя? Безумоўна, яны могуць патрабаваць: «Назавіце нам сталовую, з якой можна браць прыклад». Калі ласка. Такія пункты грамадскага харчавання ёсць. Гэта — № 61 ІПК БДУ і сталовая хімічнага корпуса. Ёсць і тут свае хібы, але ў параўнанні з вышэйуказанымі — розніца вялікая. Рэгулярна працуе буфет, у наяўнасці шырокі асартымент страў. Калектывы стараюцца найлепшым чынам арганізаваць сваю работу, у сцісłы тэрмін ліквідуюць адзначаныя раней недахопы. Ці не пара ўсім універсітэцкім пунктам грамадскага харчавання наладзіць работу так, каб наведвальнік пакідаў сталовую з добрым настроем?

М. КАВАЛЁЎ,
член групы народнага кантролю універсітэта,
В. ЧАРНУШЭНКА,
член ГНК факультэта журналістыкі, старшыня штаба «КП».

На здымку: у час праверкі.

НА КОНКУРС

АДЧУВАЦЬ АДКАЗНАСЦЬ

ПРА Таню Адрыбец я пачула ўпершыню ад старшыні прафбюро юрыдычнага факультэта Аляксандра Чыкілёва. На маё пытанне, хто з першакурснікаў актыўна ўключыўся ў прафсаюзную работу, ён, доўга не думаючы, адказаў: прафорг 4-й групы.

Таня Адрыбец не толькі прафорг, але і адказная за інтэрнацыянальную работу на факультэце. Ці не цяжка сумяшчаць усё гэта з вучобай на першым курсе?

— Бясспрэчна, нялёгка,—згаджаецца Таня, — але ўсе цяжкасці хутка праходзяць, калі адчуваеш, што ты патрэбен людзям.

У аднаго студэнта-першакурсніка справы склаліся так, што ён не атрымаў стыпендыю, інтэрнатам таксама не быў забяспечан, да таго ж матэрыяльнае становішча дома было надзвычай цяжкім. І прафорг групы дабілася, каб студэнту аказалі пэўную дапамогу.

Амаль кожны дзень да прафорга звяртаюцца аднакурснікі, людзі самых розных характараў. Іх цікавіць і правядзенне прафсаюзных мерапрыемстваў, і ход сацыялістычнага спаборніцтва, і інтэрнат, і стыпендыя, і пуцёўкі ў прафілакторый і дамы адпачынку. Каму трэба нешта растлумачыць, каму даць параду, а каму і дапамагчы. І з усім гэтым Таня спраўляецца добра. Дзе ж вытокі яе ўмелай работы з людзьмі?

Таццяна пасля закапчэння дзесяцігодкі працавала ў вялікім рабочым калектыве на абутковай фабрыцы. Ад члена цэхкома да сакратара камсамольскай арганізацыі — такі шлях яе за час работы на прадпрыемстве. Сваёй дзелавітасцю, стараннасцю, чуласцю, камсамольскай прынцыповасцю заваявала аўтарытэт. Таццяну рэкамендавалі кандыдатам у члены КПСС. А ўступіла яна ў рады Камуністычнай партыі ўжо ва універсітэце.

— Паявілася больш задач, турбот, адчула большую адказнасць, — гаворыць студэнтка.

Адчуваць адказнасць перад сабой, сябрамі, сумленнем... Напэўна, гэта галоўнае ў характары Таццяны. Нельга быць прафоргам без ініцыятыўнасці, арганізатарскіх здольнасцей. Каму, як не прафоргу, прапанаваць што-небудзь цікавае, новае ў рабоце! Сумесныя пасяджэнні камсамольскага і прафсаюзнага бюро, сумеснае правядзенне камсамольскіх і прафсаюзных сходаў — Таніна ініцыятыва.

— Добра было б укараніць такія мерапрыемствы ва ўсіх студэнцкіх групах, — дзеліцца сваімі думкамі Таццяна, — бо культурна- і спартыўна-масавую работу ў групах няма сэнсу праводзіць асобна.

У час сесіі ў групе нарадзілася яшчэ адна ініцыятыва — па кожнаму прадмету быў вызначан студэнт-кансультант, у якога можна было атрымаць даведку па незразумелай тэме. Можа і гэта дапамагло першакурснікам здаць экзамены на добра і выдатна.

А пачулі б вы, з якім майстэрствам чытае Таня ў вольны час пародыі, расказвае аб творах рускіх і замежных класікаў!

— Яе адметныя рысы — шчырасць, чуласць, уменне выслухаць і зразумець кожнага, — заўважае сяброўка Тані Ірына Дудчынкова.

Летам Таня разам са сваімі сяброўкамі будзе працаваць у студэнцкім будаўнічым атрадзе.

— Хачу, каб часцінка і маёй канкрэтнай працы прынесла людзям карысць, — так вырашыла яна.

А. ФІЛІМАНЮК.
(Прэс-цэнтр прафкома).

Кветкі ўпрыгожваюць святочную сцэну актавай залы філфака. Зала поўная. На творчую сустрэчу выпускнікоў філалагічнага факультэта па праблемах узаемасувязі ВНУ і школы прыйшло шмат гасцей. І. Я. Навуменка, дырэктар інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР; К. А. Карабай, заслужаны настаўнік, дырэктар Мядзельскай сярэдняй школы; М. А. Мур'е — заслужаная настаўніца; Рыгор Барадулін, паэт; заслужаная артыстка Р. Ф. Маленчанка і многія іншыя.

НА ЗДЫМКАХ: перад сабраўшыміся выступае заслужаная артыстка БССР Рыма Фёдараўна МАЛЕНЧАНКА.

А. МАРЧУК.

ЗНАЁМЦЕСЯ: НАШЫ СЯБРЫ

Як адзначаюць Новы год у Афганістане

Свята Новага года ў Афганістане супадае з першым днём вясны, з днём вясновага раўнадзенства — 21 сакавіка. Называецца ён «Наўроз», што ў перакладзе з афганскага значыць «новы дзень года».

Гэта свята займае асобае месца сярод іншых свят, якіх у афганскага народа вельмі шмат. У гэты дзень людзі развітваюцца з зімой і вітаюць вясну. А вясна многае мяняе не толькі ў прыродзе, але і ў жыцці людзей нашай краіны, 80 працэнтаў жыхароў якой — сяляне. Адразу ж пасля святкавання Новага года сяляне пачынаюць свой працоўны год.

Святкуюць Новы год звычайна за горадам, у спецыяльных парках і садах, якія знаходзяцца ў гарах. Шматлікія горныя рэчкі, вадапады, спевы птушак і прыемны пах кветак — усё стварае святочны, прыўзняты настрой.

Затым свята ператвараецца ў своеасаблівы кірмаш. Сяляне дэманструюць лепшыя ўзоры сваёй працы, жывёлаводы паказваюць кароў, коней, баранаў. Лепшыя экспанаты губернатар узнагароджвае прэміяй. Затым ён па традыцыі арэ ўчастак зямлі.

Не абыходзіцца святкаванне і без традыцыйных спартыўных спаборніцтваў і выступленняў артыстаў.

Неабходна адзначыць, што ў гэты дзень не прадаецца ніякая гатовая ежа, кожны гатуе яе сам і стараецца зрабіць гэта як мага лепш.

У афганскага народа шмат свят, але толькі свята Новага года праходзіць так экзатычна і цікава.

Махамед КАСЭМ,



Тыдзень працягваўся агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці факультэтаў БДУ. У гэтыя дні кампетэнтнае журы старанна падлічвае балы, дэталёва абмяркоўвае кожны канцэрт, каб з найбольшай аб'ектыўнасцю размеркаваць месцы. Але справа не столькі ў тым, хто пераможа, галоўнае, што мастацкая самадзейнасць у БДУ атрымала яшчэ большае развіццё, стала яшчэ больш масавай.

НА ЗДЫМКАХ: выступае танцавальны калектыў гістфака; на сцэне — тэатр мініяцюр журфака.

Фота **М. Дубовіка.**

ратны, утульны, студсаветам інтэрнатаў, якія акружаюць універсітэцкі стадыён, трэба падумаць аб добраўпарадкаванні нашай галоўнай спартыўнай арэны. Думаю, што і універсітэцкія будатрады звернуць увагу на гэта. Ад адміністрацыйна-гаспадарчай часткі універсітэта залежыць забеспячэнне ўсімі неабходнымі матэрыяламі.

Каб было, як па заказу

ЗІМА ў гэтым годзе была, як па заказу аматараў лыж і канькоў. З вялікім снегам, з моцным марозам. Што яшчэ трэба? Канькі і лыжы, вядома. Але навошта яны цяпер, калі снег ператварыўся ў ручаі? — спытаеце вы. Цяпер яны, вядома, не патрэбны, але ж не забывайце: «рыхтуй сані летам...»

Памятаецца, на універсітэцкай спартыўнай канферэнцыі (якая прыходзіць якраз перад першымі марозамі) шмат гаварылася пра наш стадыён: «няўтульны, пратаптаны ва ўсіх напрамках», «без туалетаў», «трэба пры шостым інтэрнаце зрабіць пункт пракату лыж», «ва ўсіх інтэрнатах не пашкодзіла б адкрыць спартыўныя пакоі, дзе будуць футбольныя мячы і шахматы, іншы спартыўны інвентар». А хтосьці сказаў, што можна ігры купіць і гантэлі... Адным словам, усе добра разумелі, што спартыўна-аздараўленчую работу ў студэнцкіх інтэрнатах трэба ўзнімаць. І як мага хутчэй.

З тае пары студэнты здалі зімовую сесію, пачалі рыхтавацца да летняй, а што зроблена? Стадыён як быў забруджаным, такім і застаўся. Прадуваецца вятрамі з усіх бакоў, без агароджы. Цяпер вясна. Самы час пагуляць у валейбол, футбол, баскетбол. Але каб выходзілі мы на стадыён акуратна, утульны, студсаветам інтэрнатаў, якія акружаюць універсітэцкі стадыён, трэба падумаць аб добраўпарадкаванні нашай галоўнай спартыўнай арэны. Думаю, што і універсітэцкія будатрады звернуць увагу на гэта. Ад адміністрацыйна-гаспадарчай часткі універсітэта залежыць забеспячэнне ўсімі неабходнымі матэрыяламі.

...Заглянем у падвал шостага інтэрната. Вы, калі на фізкультуру прыходзіце, пераапранаецеся там Раздзявалкі і зараз брудныя, няма куды павесіць куртку ці паліто, вешалкі зломаны (самі ж студэнты «пастараліся»).

А што на нашай лыжнай базе робіцца? Пах лыжнай мазі, прасмаленага дрэва і ўзоры чорна-блакітна-бурай цвілі на століі. Справа ў тым, што лыжная база знаходзіцца... пад дожджыкам(?!). Так, так, лыжы, якія па ўсіх правілах павінны захоўвацца ў сухіх памяшканнях, стаяць прама пад душавымі шостага інтэрната. Акрамя цвілі і вады, як гэта ні парадаксальна, галоўныя ворагі лыжнай базы — самі ж студэнты. Вы б пабачылі, колькі «дроў» паяўляецца на базе пасля лыжных зоркавых паходаў ці лыжных паходаў выхаднога дня. Элементарныя правілы догляду за лыжамі не выконваюцца. Не сакрэт і тое, што некаторыя студэнты і выкладчыкі будуць здаваць лыжы на базу да чэрвеня.

Міхаіл Байкоўскі, які працуе майстрам на базе, адзін пры ўсім жаданні і старанні не можа дагледзець 600 пар лыж, хоць для універсітэта гэта яўна мала (1 пара лыж на 15 чалавек). Патрэбен штатны спецыяліст, трэба неяк падключаць студэнтаў на дапамогу. Але галоўнае, лічыць Міхаіл, трэба, каб студэнты па-гаспадарску адносіліся да лыж. Тады і будзе парадак.

Але пойдзем далей. У адной з раздзявалак, у самым канцы падвала, стаіць зялёны тэнісны стол. Чаму ён тут пыліцца? Чаму не ў шостым інтэрнаце? Але тут хоць паставілі, а ў другім інтэрнаце такі стол яшчэ і не распакавалі...

Прафком у гэтым годзе закупіў спартыўны інвентар — шашкі, шахматы, тыя ж камплекты настольнага тэніса, футбольныя і валейбольныя мячы. Але ці ўсе адказныя за спорт у інтэрнатах ведаюць аб гэтым? Ці адкрыты спартыўныя пакоі? На жаль, не ўсе ведаюць, і пакоі для спартсменаў каменданты яшчэ толькі абяцаюць выдзеліць...

Але вернемся да зімовых відаў спорту. Калі з лыжамі яшчэ неяк перабіваліся, то пра пункт пракату канькоў ва універсітэце ніхто і не падумаў. Ці трэба ён? Безумоўна, трэба. І месца для масавага катання трэба. А то што атрымлівалася? Марознымі вечарамі хакейная каробка кішэла студэнтамі і хлапчукамі з бліжэйшых дамоў. Борцікі трашчалі ад удараў шайбы, ад сутыкненняў, штуршкоў... Цёмна. Цесна.

Чаму ж склалася такое правіла—выключаць электрычнае асвятленне на хакейнай пляцоўцы пасля матчаў? А чаму, наадварот, не запаліць ліхтары і не ўключыць добрую музыку?

У пачатку зімы, калі толькі лядок спрабаваў брацца, заліваліся каток для студэнтаў, але першы снег пахаваў яго...

Час ляціць імгненна. І спортклубу, прафкому, студсаветам студэнцкіх інтэрнатаў трэба ўжо зараз прадумаць закранутыя пытанні, каб наступную зіму сустрэлі мы з канькамі і лыжамі, каб стала яна сапраўды спартыўнай. І тады ўсё будзе, як па заказу.

В. ФІЛІПЧЫК,
студэнт факультэта журналістыкі.

СПАТКАННЕ СА СВЕТАМ ЦУДОЎНАГА

Непаўторнасць таленту

ТАКІЯ ПАЛОТНЫ нараджаюцца цяжка. Адзіны выток творчага натхнення— разбуджаныя ўспаміны мастака. І ніякай беспрадметнай фантазіі, ніякага паўтарэння.

Мазок, другі... І зноў — глыбокае задуменне. Як паказаць агульнавядомае з нечаканага боку? Якая палітра фарбаў здольна перадаць «колер памяці»?

— У кожнага з нас ёсць тэма, якая не старэе з гадамі, і абавязак мастака перад сваім народам — адлюстраваць яе ў сваіх творах,— так тлумачыць народны мастак БССР М. Савіцкі зварот да ваеннай тэматыкі.

Ён даўно вядомы сваім землякам і за межамі краіны палотнамі «Лаўскі бой», «У партызаны», «Расстрэл партызанкі», «Партызанская мадонна». Апошняя серыя яго карцін — «Лічбы на сэрцы» ўражвае глыбокім драматызмам, вобразамі нескаронай мужнасці, здзіўляючай вытрымкі і бясконцага жыццялюбства.

«Галгофа XX стагоддзя»... Здаецца, у змарнелым, васковым целе даўно патухла жыццё. На грудзях вязня — зорка, крывавы след жудасных здзекаў. Змрочны фон. Але рукі, што прыкаваны да рашоткі, сціснуты ў кулакі. Твар напружаны і ўпарты. Гэта — маўклівы пратэст чалавека, дух якога не скарыўся.

Аднойчы, ужо ў мірны час, сустрэў мастак былога таварыша, з якім калісьці быў у Бухенвальдзе. Той спытаў, ці напісаў ён што-небудзь аб гэтым лагеры смерці. Было гэта ў 1974 годзе... А да канца мінулага года ён закончыў дзесяць карцін. Серыя дае такое ўяўленне аб жыцці і пакутах вязняў канцлагера, якое нельга пачарапнуць ні са славесных апісанняў, ні з дакументаў.

«Канцлагер... Мала каму з цяперашніх мастакоў давялося бачыць нацызм у такой страшнай адкрытасці, як мне»,— гаворыць М. Савіцкі. Вось чаму ён не можа сёння маўчаць. Яго карціны — аб тым, што было перажыта не адным чалавекам — мільёнамі савецкіх людзей. Карціны аб тым, чаго не павінна быць ніколі.

Яго жыццё падобна на легенду. Палітрук марской пяхоты, Савіцкі б'ецца да апошняга патрона. Потым трапляе ў палон. Адзіночная камера, ланцугі. Лагер смерці Бухенвальд. Уцёкі. Зноў палон. Дахау. Але гітлераўцы не паспелі ўсіх спаліць: вызваленне!..

Амаль усе карціны Савіцкага «мнагалюдныя». А якія розныя выразы твараў! Поўныя бязмежнай надзеі («SOS»), скамянелыя ад болю і рашучыя («Канада»), натхнёныя і ўрачыстыя («Спяваюць камуністы») або назаўсёды застылыя («Летні тэатр»). Запаўшыя вочы, абвостраныя рысы. Дзе іх можна змаляваць? Калі Міхаілу Андрэевічу задалі такое пытанне, ён адказаў: «Там...»

У мастака — вялікая палітра вобразаў. І ўсе яны малююцца па памяці. Як чалавек, які выжыў, ён адчувае сябе назаўсёды абавязаным тым, хто загінуў. Таму і працуе без натуршчыкаў.

Мастак перакладае на мову жывапісу ўласны боль і, ствараючы абагульненыя вобразы, нярэдка ўзнімаецца да высокай сімволікі. І нельга не параўнаць палотны М. Савіцкага з кадрамі выкрываючай дакументальнай хронікі.

Якога ж колеру ўспаміны мастака? Спалучэнне залатога з чорным. І толькі. Гэтым падкрэсліваецца несумяшчальнасць дабра і зла, любві і нянавісці, жыцця і смерці.

Да гэтых палотнаў хочацца вяртацца зноў і зноў. Каб запомніць на ўсё жыццё. Кажуць, што ўражанне гледача ўзнікае паступова. У адносінах да карцін Савіцкага яно падобна на выбух.

Н. АРЛОЎСКАЯ,
Р. ПЯТРОВІЧ,
студэнткі журфака.

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС

220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Заказ № 586. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. АТ 11686